ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі
і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.
№ 5 Чацвер, 21 Верасня 1944 г.

ШЫРЭЙ РАЗГОРНЕМ СЯЎБУ АЗІМЫХ, НЕ ПАКІНЕМ НЕ ЗАСЕЯНЫМ НІ АДНАГО ЗАГОНА ЗЯМЛІ! СВОЕЧАСОВАЯ СЯЎБА—ЗАЛОГ БУДУЧАГА ЎРАДЖАЮ!

## НЕ ЗАЦЯГВАЦЬ СЯЎБУ АЗІМЫХ

Сяўба азімых — важная гаспадарчая задача. У гэтым годзе мы павінны значна пашырыць пасяўную плошчу. Кожны селянін павінен прыкласці максімум напружання і паспець засеяць даведзены план.

Аднак факты гавораць аб тым, што ў радзе сельсоветаў аб сяўбе яшчэ толькі думаюць, ссылаючыся на сухую пагоду. У некаторых сельсоветах (Белавіцкі, Альшаніцкі) хаця і прыступілі да сяўбы але сеюць марудна. Гэта тлумачыцца тым, што кіраўнікі сельсоветаў і актыў не павялі дастатковай растлумачальнай работы сярод насельніцтва, накіраваўшы яе на своечасовае заканчэнне сяўбы азімых.

Сяўба азімых у раёне яўна зацягваецца. Зацягваецца таму, што гэта пытанне не ставілася яшчэ належным чынам. Сельскім советам, партыйным, совецкім і комсамольскім арганізацыям трэба ўзяцца за гэту справу па-сапраўднаму, арганізаваць масавую сяўбу азімых. Ні адзін гектар зямлі, прадназначаны пад пасеў не павінен пуставаць.

## РАЗГОРНЕМ ПРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦСПАБОРНІЦТВА

Прыбліжаецца 27-я гадавіна вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Працоўныя нашага раёна, як і ўвесь совецкі народ, павінны сустрэць гэта вялікае свята новымі працоўнымі подвігамі.

Ужо зараз на прадпрыемствах, ва ўстановах, у вёсках трэба разгарнуць шырокае прадкастрычніцкае спаборніцтва, сустрэць гэтую слаўную дату звышпланавым выпускам прадукцыі, датэрміновым выкананнем усіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Вопыт перадавых сялян, лепшых рабочых заводаў, майстэрняў і арцеляў як ніколі павінен быць выкарыстан у прадкастрычніцкім спаборніцтве.

Шырэй разгорнем прадкастрычніцкае спаборніцтва! Праславім нашу радзіму новымі подвігамі на працоўным фронце!

## На прыёмным пункце

З поўнай нагрузкай працуе прыёмны пункт у Косаве. Адна за другой прыбываюць фурманкі, нагружаныя мяшкамі збожжа. Сяляне, сабраўшыя багаты ўраджай, здаюць хлеб дзяржаве, выконваюць свой важнейшы абавязак перад радзімай.

Гардзейка Дзімітрый Захаровіч з в. Рацкевічы Бусяжскага сельсовета замест 170 кг здае 252 кг. Поўнасцю разлічваецца з дзяржавай аднасяльчанін Гардзейкі Кульганене Ігнат Нікіфаравіч.

Многа хлеба паступае з Альшаніцкага сельсовета. Сяляне вёскі Квасавічы здалі ўжо звыш 12 тон хлеба.

Поўнасцю разлічыліся з дзяржавай сяляне Бабей Александр Фёдаравіч, Бурвін Александр Александравіч, Максімчык Дзімітрый Кліменцьевіч і многія другія.

Акрамя гэтага сяляне в. Квасавічы здалі ў фонд абароны 1271 кг. збожжа.

А. Каліна

## Выканалі збожжапастаўкі

Зайцешук Марыя і 70-ці гадовы Грыгорый Ігнацьевіч Максімчык карыстаюцца вялікай павагай з боку жыхароў в. Белавічы.

Не гледзячы на старасць Грыгорый Ігнацьевіч першым разлічыўся з дзяржавай па здачы збожжа. Ён з'яўляецца актывістам, часта выступае на сходах, заклікаючы аднасяльчан на своечасовае выкананне ўсіх мерапрыемстваў партыі і ўрада.

Зайцешук Марыя таксама поўнасцю выканала план здачы збожжа дзяржаве, актыўна ўдзельнічае ва ўсіх кампаніях.

Нядаўна сяляне на агульным сходзе адзінадушна выбралі яе народным засядацелем у нарсудзе.

ГРУДАВОЙ, сакратар Белавіцкага сельсовета.

## У двух сельсоветах

Перадавымі па хлебаздачы ідуць у раёне Альбінскі і Гошчаўскі сельсоветы. Сяляне гэтых сельсоветаў, натхнёныя гістарычнымі перамогамі Чырвонай Арміі, распачалі масавую хлебаздачу дзяржаве.

Па вёсцы Гошчава першымі разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках Панашчык С. Д. Валодзік Н. К., Гойшык М. Н., і другія.

У Альбінскім сельсовеце сяляне ўсіх вёсак спаборнічаюць паміж сабой на хутчэйшую хлебаздачу. Уперадзе ідзе в. Кулеш . Тут поўнасцю выканаи план збожжапастаўкі.

Поўнасцю разлічыліся з дзяржавай і другія вёскі.

М. Крывы, Цярэшка.

# Ад Совецкага Інформбюро

## З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 19 ВЕРАСНЯ

На працягу 19 верасня войскі 3-га Прыбалтыйскага фронта прарвалі абарону праціўніка і авалодалі чыгуначным вузлом і буйным апорным пунктам праціўніка - гарадам ВАЛГА, СЫРВА.

На ўсход ад гор. РЫГА нашымі войскамі занята больш 600 насялёных пунктаў.

Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта прарвалі абарону праціўніка на паўднёвы ўсход ад г. Рыга, прасунуліся наперад да 40 кіламетраў. расшырыўшы прарыў па фронту да 120 кіламетраў. Занята больш 2000 насялёных пунктаў.

На захад ад гор. ЕЛГАВА нашы войскі паспяхова адбілі ўсе атакі праціўніка і панеслі яму вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

У Заходняй Румыніі войскамі Чырвонай Арміі і румынскай арміі занят буйны чыгуначны вузел ТЭМІШОАРА.

За 18 верасня 1944 г. нашымі войскамі на ўсіх франтах падбіта і знішчана 121 нямецкі танк. У паветраных баях і агнём зянітнай артылеры збіта 21 самалёт праціўніка.

* * *

У ноч на 19 верасня наша авіяцыя зрабіла масіраваны налёт на сталіцу Венгрыі БУДАПЕШТ і чыгуначны вузел ЧОП.

Войскі саюзнікаў занялі на германскай тэрыторыі горад ДЗЮГЕНГЕР — у 6 км. ад Люксембургскай граніцы.

# У школе

1 верасня пачаліся заняткі ў Косаўскай няпоўна-сярэдняй школе. З шырока адчыненымі дзвярыма, з прыветлівымі лозунгамі „Дабро пажалаваць“ сустрэлі светлыя класы сваіх юных наведвальнікаў. Вялікую радасць і захапленне адчулі вучні ў першы дзень заняткаў. Гэта-ж толькі падумаць, пасля трох гадоў ненавіснай нямецкай акупацыі, калі страшна было выйсці на вуліцу — і зноў у школу, родную, совецкую! І настаўнікі такія ласкавыя, чуллівыя і так зразумела і проста выкладваюць усе прадметы...

Скора месяц як працуе школа. Вучні здружыліся паміж сабой, многія сталі сябрамі на ўсё жыццё. Школа стала самым любімым месцам юных патрыётаў.

Гаворачы аб школе, аб яе дзейнасці, нельга не адзначыць тую вялікую работу, што прарабіў педкалектыў на чале з дырэктарам т. Карабецян яшчэ да адкрыцця школы.

Нямецкія акупанты не лічыліся ні з чым. Усе культурныя ўстановы яны ператварылі у канюшні, або ў казармы для салдат. У першыя дні пасля прыхода Чырвонай Арміі памяшканне школы было зусім непрыгодным для заняткаў. Вокны і рамы былі пабіты, унутры памяшкання валялася цэгла і штукатурка, пабітае шкло.

Т. Карабецян пры дапамозе гарсовета зразу-ж арганізавала рамонт і ачыстку памяшкання. Дзякуючы правільнай арганізацыі працы да 1 верасня школа гатова была для прыёма дзяцей.

Зараз т. Карабецян усю ўвагу ўдзяляе правільнай арганізацыі вучэбнага працэса. Яна сама старанна рыхтуецца да кожнага ўрока і патрабуе гэтага ад кожнага настаўніка. Даць вучням грунтоўныя веды, прывіць ім любоў да Радзімы, зрабіць іх сапраўднымі будаўнікамі шчаслівага, радаснага жыцця — аснаўная задача, якая стаіць перад совецкай школай. Гэтай мэце павінна быць падначалена ўся дзейнасць школы.

А. К.

# Наладзіць работу сталовай

Прайшло 2 месяцы з часу арганізацыі сталовай. А парадку ў ёй няма і на сёнешні дзень. Становішча з кожным днём рабіцца ўсё больш нецярпімым.

Доўгі час тут не было ні загадчыка ні повара. Прадукты атрымлівалі каму ўздумаецца. Варылі і кармілі як хацелі і чым хацелі. Комната для работнікаў совецкага і партыйнага актыва існуе фармальна. Харчуецца ў ёй хто толькі хоча. Разніцы ў абедах няма ніякай. Людзі сядзяць гадзінамі, таму што на ўсю сталовую маецца толькі 4 тарэлкі.

У сталовай да гэтага часу няма зацверджанага кантыгента людзей, якія сталуюцца. Амаль кожны дзень не хапае абедаў. Задаецца законнае пытанне: чым займаецца райспажыўсаюз і яго старшыня т. Зарэцкі? Ці не пара зжыць усе гэтыя непаладкі і навесці большэвіцкі парадак у сталовай?

В. а. Рэдактара А. П. РУДОЙ.

## АБ'ЯВА

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян Косаўскага раёна, што органам ЗАГС вытвараецца:

1. Рэгістрацыя шлюбаў, нараджэння і смерці.
2. Перарэгістрацыя выпадкаў нараджэння і смерці, зарэгістраваных нямецкімі ўладамі ў перыяд акупацыі.

НА ПАДСТАВЕ ПАСТАНОВЫ ЦВК і СНК СССР ад 27-7-36 г.

рэгістрацыя нараджэння і смерці з'яўляецца абавязковай.

Нараджэнне павінна быць зарэгістрыравана ў ЗАГС'е не пазней месяца з дня нараджэння, а мёртва-народжаных не пазней 24 гадзін. Выпадкі смертнасці не пазней 3-х дзён з моманта наступлення смерці.

Асобы, якія нарушаць устаноўленыя законам тэрміны, органамі міліцыі будуць прыцягнуты да адказнасці ў адміністрацыйным парадку.

Бюро ЗАГС знаходзіцца на вул. М. Горкага і працуе з 9 гадзін раніцы да 5 гадзін вечара.

БЮРО ЗАГС

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкога, 106.